УДК 329 "19"

# ЛІКВІДАЦЫЯ ШМАТПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ГАДЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

***Хаданёнак В.М., канд. гіст. навук***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца працэс згортвання шматпартыйнасці на беларускіх землях у 1917–1925 гг. Аналізуецца ўплыў кастрычніцкай рэвалюцыі на трансфармацыю партыйна-палітычнай сістэмы.*

Ключавыя словы: шматпартыйная сістэма, дзяржава, бальшавікі, цэнзура, улада, кастрычніцкая рэвалюцыя.

Шматпартыйная сістэма з'яўляецца важным падмуркам для паспяховага развіцця грамадства. На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 15 партый. Усе яны тым ці іншым чынам спрабуюць уплываць на палітычную сітуацыю ў краіне. Пры гэтым, большасць партый не карыстаецца папулярнасцю і падтрымкай насельніцтва. Магчыма, адной з прычын гэтага з'яўляецца тое, што ў савецкай краіне працяглы час функцыянавала аднапартыйная палітычная сістэма.

Згодна з тэарэтыка-метадалагічнымі і ідэалагічнымі ўстаноўкамі бальшавізма, палітычная партыя разглядалася выключна з класавых пазіцый. Палітычная ж барацьба класаў, у сваю чаргу, атаясамлівалася з барацьбой партый. Сістэма савецкай ўлады ў першыя паслярэвалюцыйныя гады была скіравана не на мірнае суіснаванне партый у традыцыйным парламенцкім рэчышчы, а на іх барацьбу, з паступовай і няўмольнай ліквідацыяй усіх апазіцыйных структур.

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. партыя бальшавікоў аднаасобна стала партыяй улады. Нават тыя арганізацыі, таварыствы і грамадскія аб'яднанні, якія імкнуліся ўкараніць сацыялістычныя пераўтварэнні ў паўсядзённае жыццё праз дзейнасць прафсаюзных суполак і сістэму сацыяльнай дапамогі, перайшлі на паўлегальнае, а часам і нелегальнае становішча.

Між іншым, у найбольш цяжкія для бальшавікоў часы, калі іх пазіцыі былі пад пагрозай, яны добра ішлі на кантакт і кампраміс з іншымі партыямі. Але рабілася гэта толькі з адной практычнай мэтай – адстаяць, захаваць і ўмацаваць сваю ўладу. Да прыкладу, у кастрычніку 1917 г., бальшавікі дапускалі фармаванне кааліцыі з іншымі рэвалюцыйна-дэмакратычнымі партыямі. Для гэтага патэнцыйныя партнёры РСДРП(б) павінны былі выканаць шэраг умоў, сфармуляваных 1–2 лістапада 1917 г. Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам. У асноўным, яны зводзіліся да прызнання Саветаў адзінай крыніцай улады. Гэтыя ўмовы (і то з пэўнымі агаворкамі) былі прыняты толькі партыяй левых эсэраў. У перыяд часу з кастрычніка 1917 г. па 1925 г. бальшавікі афармілі палітычны блок з левымі эсэрамі і нават пайшлі на часовую легалізацыю меншавікоў і правых эсэраў.

З першых дзён свайго існавання савецкая дзяржава надала сабе выключнае права на валоданне і кантроль за інфармацыяй. Дзеля гэтага была створана строгая сістэма дзяржаўных і партыйных органаў. У Беларусі рэвалюцыйная цэнзура ўводзілася адразу пасля абвяшчэння савецкай улады. 28 кастрычніка 1917 г. ў Беларусі спынілі сваё існаванне больш за 10 «контррэвалюцыйных газет» [1, с. 50]. 30-га лістапада 1917 г. была зачынена за «антыбальшавіцкую прапаганду» газета «Мінская іскра», у снежні гэтага ж года быў спынены выпуск «Вячэрніх навінаў» і эсэраўскага «Сацыяліста-рэвалюцыянера» [2, с. 31]. Арыентацыя на закрыццё «пагромных і контррэвалюцыйных выданняў» была цалкам ухвалена Цэнтральным Камітэтам РСДРП(б), які загадваў толькі ўзмацніць працу ў гэтым кірунку.

15-га чэрвеня 1919 г. на паседжанні Калегіі Надзвычайнай Камісіі Літбела было прынята рашэнне аб арганізацыі цэнзурнага пункта пры Мінскай паштова-тэлеграфнай канторы [3, с. 221]. Ужо ў 1921 г. аддзелы ваеннай цэнзуры ў БССР цалкам кантралявалі не толькі выпуск друкаванай прадукцыі, але і ўвоз яе з-за мяжы, а таксама ўсю міжнародную і ўнутраную паштова-тэлеграфную карэспандэнцыю. Існаваў пільны кантроль за масавы выданнямі і з боку кампартыі. Партыйныя цэнзары ўважліва чыталі перыядычныя выданні і рабілі

адпаведныя высновы, якія затым дасылалі ў цэнтральнае бюро Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі.

Бальшавікі бескампрамісна вялі барацьбу з усялякімі праявамі іншадумства, а тым больш з канкрэтнымі дзеяннямі, што не супадалі з іх інтарэсамі. Прымус станавіўся звычайнай з'явай. У гэтых умовах іншыя партыі ўсё больш страчвалі свае дасягненні і ўплыў у грамадстве. Ліберальна-дэмакратычныя і права-кансерватыўныя партыі і групы пачалі адразу выцясняцца з легальнай палітыкі. Кіраўнікоў кадэтаў арыштоўвалі і аддавалі пад суд рэвалюцыйных трыбуналаў. У лістападзе 1917-га – лютым 1918-га гг. мясцовыя савецкія органы ў Мінску, Магілёве, Віцебску, Гомелі і іншых беларускіх гарадах правялі па ініцыятыве бальшавікоў кампанію рэпрэсій супраць беларускіх правых арганізацый. У канцы 1917-га – пачатку 1918-га года ўсе правыя арганізацыі вымушаны былі перайсці на нелегальнае становішча [4, с. 101]. У студзені 1918 г. быў распушчаны «Саюз беларускага народа» ў Віцебску, а яго лідары: Ф. І. Грыгаровіч, Г. І. Палонскі і Б. А. Бялыніцкі-Біруля – увязнены, а ў верасні 1918 г. расстраляны [5, с. 109].

У Віцебску 5-га студзеня 1918-га г. адбылася масавая дэманстрацыя ў падтрымку Устаноўчага Сходу, арганізаваная Бундам, меншавікамі і правымі эсэрамі. Яна была жорстка разагнаная бальшавікамі. У гэтыя ж дні была распушчана гарадская дума, адбыліся арышты актывістаў сацыялістычных партый, зачынена газета «Барацьба». Асабліва пацярпеў Бунд. Газета «Дэр Векер» ад 8-га студзеня 1918 г. зазначала: «У нас арыштоўваюцца людзі за прыналежнасць да Бунда» [6, с. 481].

Вясной 1918 года кіраўніцтва РКП(б) санкцыянавала правядзенне рэпрэсій супраць анархістаў, якія даволі значна закранулі беларускія землі. Пасля спробы мецяжу левых эсэраў у Маскве, значныя праблемы напаткалі і гэту партыю. На працягу ліпеня 1918 г. левыя эсэры былі выключаны са складу Магілёўскага і Віцебскага губернскіх выканаўчых камітэтаў. 14 ліпеня 1918 г. быў увязнены ўвесь склад Віцебскага губернскага камітэта партыі левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў. А 14-га сакавіка пленум Цэнтральнага Камітэта РКП(б) пастанавіў партыйным арганізацыям узмацніць барацьбу з левымі эсэрамі [7, с. 324]. Рэшткі леваэсэраўскіх арганізацый, а менавіта рэвалюцыйныя сацыялісты-народнікі Беларусі, спынілі сваю дзейнасць у 1920 г.

Негатыўнімі былі і адносіны бальшавікоў да правых эсэраў і меншавікоў. Прамаўляючы на сходзе партыйных работнікаў 27-га лістапада 1918-га года У. І. Ленін зазначыў: «Калі нам здараецца сустрэць заяву групы дробнабуржуазнай дэмакратыі, што яна хоча быць нэўтральнай у адносінах да Савецкай улады, – мы павінны сказаць: «нэўтральнасць і добрасуседскія адносіны – гэта старое рызьзё, якое нікуды не гадзіцца з пункту погляду камунізму» [8, с. 60].

16–17-га лютага 1921 г. ў БССР была праведзена маштабная чэкісцкая аперацыя супраць палітычнай апазіцыі. У вязніцах апынуліся 862 эсэры. 8-га сакавіка 1921 г. прайшла другая хваля арыштаў, якая шырока закранула мясцовыя арганізацыі і ячэйкі партыі. У агульнай колькасці за кратамі апынулася каля 2000 беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У лютым 1921 г. Палітбюро Цэнтральнага Камітэта РКП(б) прыняло пастанову аб чарговым «узмацненні арыштаў» меншавікоў і эсэраў. 28-га лютага быў выдадзены адпаведны загад ВЧК, які ўказваў усім Губернскім ЧК «у самы кароткі тэрмін разбіць апарат эсэраў і меншавікоў, праводзячы арышты і высяленні» [9, с. 61]. У сакавіку 1921 года з БССР былі высланы выяўленыя меншавікі і эсэры, праведзена чыстка савецкага і гаспадарчага апарата [10, с. 56].

З 1921 года членаў «антысавецкіх» партый, нават тых, хто спыніў сваю актыўную дзейнасць, пачалі браць на ўлік у ЧК, а затым у ГПУ. У чэрвені 1922 г. Цэнтральнае Бюро КП(б)Б прыняло да ведама паведамленне старшыні ГПУ Я. К. Ольскага аб арышце меншавікоў. У канцы жніўня 1922 г. ЦБКП(б)Б адобрыла падрыхтаваную ГПУ пастанову «Аб высылцы меншавікоў з Беларусі». У тым жа месяцы ГПУ РСФСР накіравала ў Мінск дырэктыву аб высылцы за межы рэспублікі эсэраў, каб гэтым самым канчаткова разграміць іх.

XII-ая Усерасійская канферэнцыя РКП(б), якая праходзіла 4–7-га жніўня 1922 г. прыняла рэзалюцыю «Аб антысавецкіх партыях і рухах». Яна сведчыла пра тое, што цяпер дазвалялася прымяняць рэпрэсіі не толькі да членаў пэўных партый, але і да іншадумцаў увогуле. М. П. Томскі ў красавіку 1922 г. на XI-ым з'ездзе РКП(б) зазначаў: «У нас шмат партый, але ў адрозненні ад замежжа, у нас адна партыя ва ўладзе, а астатнія – у вязніцы» [11, с. 11]. Апроч таго, ужо у першай палове 20-х гадоў спроба стварыць палітычную групу,

якая б знаходзілася па-за кантролем структур РКП(б) і ўдзел у такой групе разглядаліся як злачынства. Павятовымі бюро ГПУ БССР, якія былі створаны па распараджэнню Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта 6-га лютага 1922 г., ставілася ў абавязак весці барацьбу з палітычнымі партыямі і контррэвалюцыйнымі таварыствамі. У складзе палітбюро меўся адмысловы ўпаўнаважаны па палітычных партыях.

Такім чынам, да канца 1925 года некамуністычная апазіцыя ўнутры БССР перастала існаваць, а беларускія палітычныя партыі былі ліквідаваны ці дэзарганізаваны. Аднапартыйная сістэма ў Савецкай Беларусі канчаткова аформілася ў сваіх асноўных рысах. Адбылася абсалютная канцэнтрацыя ўсей паўнаты ўлады ў руках бальшавікоў. Стварэнне іншых палітычных партый не дазвалялася.

Аднапартыйная сістэма, якая ўтварылася ў БССР, уяўляла сабой рэгіянальны варыянт савецкай аднапартыйнай мадэлі. Лідэры РСДРП(б) жадалі поўнай ліквідацыі любых апазіцыйных груп з палітычнага жыцця, незалежна ад іх праграмных установак. Адсутнасць трывалага грунту традыцый парламенцкай дэмакратыі не дазволіла новаўтвораным пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі партыям паразумецца між сабой і скласці адзіны моцны партыйны блок (у супрацьвагу бальшавіцкаму).

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Каменская Н. В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР / Н. В. Каменская. – Мн.: Выд-ва АН БССР, 1954. – 183 с.
2. Головко А. А. Социалистическая законность в деятельности местных советов БССР (1917-1928 гг.) / А. А. Головко, В. А. Дорогин, В. С. Карпик . – Мн.: Изд-во акад. наук БССР, 1960. – 316 с.
3. Протько Т. С Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т. С. Протько. – Мн.: Тесей, 2002. – 688 с.
4. Иоффе Г. З, Крах российской монархической контрреволюции / Г. З. Иоффе. – М.: Наука, 1977. – 320 с.
5. Кастрычнік на Беларусі: зб. артыкулаў і дакументаў: Матэрыялы да гісторыі Кастр. рэвалюцыі на Беларусі / Каміс. ЦВК БССР па адзначэнні 10-годдзя Кастр. рэвалюцыі і Гістпарту ЦК КП(б)Б. Вып.1 / Склад. С. Агурскі. – Мн., 1927. – 487 с.
6. Бунд в Беларуси, 1897–1921. Документы и материалы / сост. Э. М. Савицкий – Мн.: БелНИИДАД, 1997. – 608 с.
7. Малашко А. М. К вопросу об оформлении однопартийной системы в СССР / А. М. Малашко. – Мн.: Изд-во БГУ, 1969. – 320 с.
8. Ленін У. І. Аб дробнабуржуазных партыях / У. І. Ленін – Мн., 1927.
9. Павлов Д. Б. Большевистская диктатура против социалистов и анархистов (1917 – середина 1950-х гг.) / Д. Б. Павлов. – М.: Росспэн, 1992. – 232 с.
10. Платонаў Р. П. Беларусь у міжваенны перыяд. Старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц / Р. П. Платонаў. – Мінск: [БелНДІДАС], 2001. – 281 с.
11. Вернигоров В. И. Политические партии и общественные движения в России и Беларуси: вторая половина XIX – первая треть XX века / В. И. Вернигоров. – Мн.: Амалфея, 2001. – 175 с.


УДК 94(48).081

# ПЕРВАЯ МИРОВАЯ ВОЙНА И РАСКОЛ ЕВРОПЕЙСКОЙ И РОССИЙСКОЙ СОЦИАЛ-ДЕМОКРАТИИ

***Бондаревский А.В., доц.***

*Санкт-Петербургский государственный электротехнический университет «ЛЭТИ» им. В.И. Ульянова (Ленина),*

*г. Санкт-Петербург, Российская Федерация*

Реферат. *В докладе рассматривается влияние националистического и патриотического подъема народных масс в начале Первой мировой войны на антивоенную тактику парламентских социал-демократических партий, а также раскол внутри РСДРП и курс большевиков на использование войны для разжигания революции.*